Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За ленінскія кадры

ОРГАН партбюро, камітэта ЛКСМБ, прафкома, МК і рэктарыята Беларускага дзяржаўнага універсітэта

№ 17 (111) | 24 кастрычніка 1940 г. | Год выдання VI

„Цяпер, калі навучанне ў ВНУ становіцца платным, кожны студэнт будзе падыходзіць да сваіх вучэбных заняткаў з большым пачуццём адказнасці, зразумее неабходнасць упорнай работы...“ *(„Правда“)*

★ ★ ★

ПАВЫСІЦЬ ЯКАСЦЬ ВУЧОБЫ

Надзвычайны рост социялістычнай культуры нашай квітнеючай радзімы. Выраслі за годы совецкай улады сотні новых ВНУ, многія — па спецыяльнасцях, невядомых для царскай Расіі. Ордэнаносная Беларусь, на тэрыторыі якой раней не было ні адной вышэйшай навучальнай установы, зараз мае свой універсітэт, сетку педагагічных інстытутаў і другіх ВНУ і ВТНУ. Дзесяткі тысяч выпускнікоў совецкіх ВНУ ствараюць касцяк новай совецкай інтэлігенцыі, самай перадавой інтэлігенцыі ў свеце.

Велізарныя сродкі трацяцца на вышэйшую асвету. Зараз, улічваючы ўзросшую матэрыяльную забяспечанасць працоўных СССР, урад ускладае некаторую частку гэтых расходаў на саміх працоўных. Як не вялікa гэтая частка, можна бачыць на прыкладзе нашага універсітэта, дзе навучанне студэнта абыходзіцца каля 5000 тыс. рублёў. Зараз сам студэнт будзе аплачваць, такім чынам, толькі 8 проц. усіх расходаў, а 92 проц. прадаўжае несці дзяржава.

Пастанова Совета Народных Камісараў СССР устанаўляе таксама новы парадак назначэння стыпендый. Гэты парадак прадугледжвае назначэнне стыпендый толькі тым студэнтам, якія ў вучобе выяўляюць выдатныя поспехі і маюць не менш двух трэцей адзнак «выдатна», а астатнія — не ніжэй «добра». Гэты парадак выходзіць з вялікага социялістычнага прынцыпа — кожнаму па яго рабоце.

«Слова стыпендыят,—піша «Комсамольская правда», — у цяперашніх умовах набывае зусім новае значэнне. Гэта не ўтрыманец дзяржавы. Гэта працавіты, упорны, здольны чалавек, які вучыцца ў поўную меру сваіх сіл, якога за гэта дзяржава заахвочвае і падтрымлівае.

Вышэйшая асвета даступна ў нашай краіне кожнаму маладому чалавеку, якога не палохае ўпорная работа, які не баючыся стомленасці, гатоў карабкацца па камяністых сцежках да ззяючых вяршынь навукі».

Заваяваць права на стыпендыю можа ўсякі студэнт, які добрасумленна адносіцца да навукі, любіць яе, імкнецца пранікнуць у таямніцы навукі, каб у творчай рабоце на практыцы прыкласці атрыманыя веды.

А то былі сярод нашых студэнтаў людзі выпадковыя, захопленыя агульным патокам, якія іншы раз проста нядобрасумленна адносіліся да справы і атрымлівалі дзяржаўную стыпендыю. Гэтыя людзі цягнуліся на пасрэдных адзнаках, пераздавалі экзамены па некалькі разоў. Якая карысць дзяржаве ад гэтых людзей, калі нават яны і скончаць ВНУ? Ці не было і няма ў нашым універсітэце такіх студэнтаў? Калі-б іх не было, то не магло-б быць такога факта, калі былога студэнта, скончыўшага фізмат Мазурэнка прышлося знімаць з работы ў школе, бо ён не змог нават рашыць задачы для 10-га класа школы, або, калі некаторых студэнтаў падобных Амбросаву (геофак) прыходзілася выключаць з трэцяга або чацвертага курса.

Але ў ВНУ, у тым ліку і ва ўніверсітэце, ёсць здаровы, працаздольны студэнцкі калектыў, ёсць сталінскія стыпендыяты. Яны з'яўляюцца прыкладам совецкага студэнта.

Вазьміце студэнта-гісторыка Абецэдарскага. Ён круглы выдатнік у вучобе, праяўляе вялікую цікавасць да навуковай работы. Яго навуковы артыкул будзе апублікаван у бліжэйшым выпуску «Вучоных запісак універсітэта». І ўсё гэта яму не перашкаджае прымаць самы актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. Тое-ж самае можна сказаць аб студэнтцы III курса гістфака, сталінскай стыпендыятцы Двоскінай і аб радзе другіх.

Кожны студэнт зараз павінен больш і лепш працаваць, таму што прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні да яго самастойнай работы.

Загад Камітэта па справах вышэйшай школы ўводзіць неабавязковасць наведвання раду лекцый, але ад студэнта патрабуецца строгая дысцыпліна і арганізаванасць, паколькі здача экзаменаў і выкананне практычных работ павінна праходзіць у дакладна ўстаноўленыя тэрміны. Той, хто не падпарадкуе апаведнаму рэжыму сваю самастойную работу, немінуча адстане.

Няма сумнення, што вышэйшая школа пасля гэтай пастановы Соўнаркома зможа падняць сваю работу на яшчэ больш высокі ўзровень.

★ ★ ★

У КАМІТЭЦЕ ПА СПРАВАХ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

Усесаюзны камітэт па справах вышэйшай школы выдаў загад аб мерапрыемствах па выкананню пастановы Совета Народных Камісараў СССР аб устанаўленні платнасці навучання ў вышэйшых навучальных установах і аб зменнені парадку назначэння стыпендый студэнтам.

Камітэт прапанаваў дырэктарам ВНУ устанавіць строгі кантроль за ўзносам платы за навучанне, і студэнтаў, якія не ўнеслі ва ўстаноўленыя тэрміны плату, лічыць выбыўшымі з вышэйшых навучальных устаноў.

Камітэт устанавіў наступны парадак назначэння стыпендый. На стыпендыю залічаюцца студэнты, якія атрымалі на экзаменах не менш двух трэцей адзнак «выдатна», а астатнія — не ніжэй «добра». З 1 лістапада г. г. залічаюцца на стыпендыю: студэнты першага курса, прынятыя без іспытаў як выдатнікі сярэдняй школы, а таксама атрымаўшыя на прыёмных экзаменах не менш двух трэцей адзнак «выдатна», а астатнія — не ніжэй «добра»; студэнты, пачынаючы з другога курса, якія атрымалі на веснавой экзаменацыйнай сесіі не менш двух трэцей адзнак «выдатна», а астатнія — не ніжэй «добра». Студэнтам-стыпендыятам, якія абараняюць дыпломны праект, або здаюць дзяржаўныя экзамены да 1 студзеня 1941 года, захоўваюцца існуючыя стыпендыі. Залічаныя на дзяржаўную стыпендыю студэнты з ліку маючых патрэбу ў дапамозе аслабатяюцца ад платы за навучанне.

У загадзе далей указваецца, што ў вышэйшых навучальных установах дапускаецца свабоднае наведванне студэнтамі вучэбных заняткаў па некаторых дысцыплінах (не больш адной трэці ад дысцыплін, прадугледжаных вучэбным планам), з абавязковым выкананнем практычных работ і здачай усіх экзаменаў ва ўстаноўленыя вучэбным планам тэрміны.

Студэнтам прадстаўлена права пераводу на вячэрнія і завочныя аддзяленні або ў іншую аднатыпную ВНУ з дазволу дырэктара гэтай вышэйшай навучальнай установы.

Наркаматам дазволена студэнтаў, скончыўшых ВНУ, але не здаўшых дзяржаўных экзаменаў або не абараніўшых дыпломнага праекта і выказаўшых жаданне перайсці на практычную работу, накіроўваць на вытворчасць з прадастаўленнем ім права абароны дыпломнага праекта або здачы дзяржаўных экзаменаў на працягу двух год. («Правда»).

Разгарнуць агітацыйную работу ў інтэрнатах

Агітацыйная работа не ёсць праходзячая кампанія. Яна павінна праводзіцца бесперапынна, у пэўным планавым парадку. Але ва універсітэце ёй удзяляецца чамусьці недастатковая ўвага. Грамадскія арганізацыі гэтым участкам работы чамусьці мала цікавяцца. Праўда, некаторыя станоўчыя вынікі ў справе палепшання палітыка-масавай работы, у збліжэнні студэнтаў з навуковымі работнікамі даў метад прымацавання партбюро асобных інтэрнатаў да партыйных груп.

Партгрупа гістфака ў гэтым вучэбным годзе пачала праводзіць культурна-масавую работу ў прымацаваных інтэрнатах № 54 і 35 па Студэнцкай вуліцы. Гутарку аб міжнародным становішчы правёў у ленінскім кутку тав. Шульман. Дэкан гістфака тав. П'янкоў і навуковы работнік тав. Штэйнберг таксама наведалі інтэрнат, дзе тав. Штэйнберг правёў гутарку аб комуністычнай маралі.

Гутаркі былі праведзены таксама навуковымі работнікамі комуністамі тт. Партон і Шабуня.

Непрыкметную і незавідную ролю адыгрывае прафком у справе правядзення культурна-масавай работы сярод студэнтаў у інтэрнатах. У радзе інтэрнатаў ёсць ленкуткі, але яны абсталяваны дрэнна, няутульна, недастаткова забяспечваюцца газетамі і іграмі.

КАЦМАН,
парторг гістфака.

З А Г А Д № 196

Па Беларускаму Дзяржаўнаму Універсітэту

18 кастрычніка 1940 года. **г. Мінск**

У сувязі з пастановай СНК СССР і загадам КВШ ад 12 кастрычніка 1940 г. за № 857 аб устанаўленні платы за навучанне і аб зменнені парадку назначэння стыпендыі студэнтам — **загадваю:**

1. Дэканам факультэтаў і вучэбнай часці прадаставіць мне к 20 кастрычніка спіскі студэнтаў-выдатнікаў, а таксама здаўшых экзамены ў злошнюю сесію і атрымаўшых не менш двух трэцей выдатных адзнак, а астатнія — не ніжэй «добра» для залічэння на стыпендыю з 1 лістапада г. г.

2. Устанавіць плату за навучанне ва універсітэце, у сувязі з пастановай СНК СССР, у размеры 400 рублёў у год, якая ўносіцца навучаючымісяў два тэрміны. За першае паўгоддзе 1940/41 вучэбнага года плата за навучанне павінна быць унесена не пазней 1 лістапада г. г. Папярэджваю, што ўсе студэнты, якія не ўнясуць плату за навучанне к устаноўленаму тэрміну, будуць адлічаны з універсітэта.

3. Прыём грошай за навучанне даручаю тав. Фрыдман Р. Э. Плата за навучанне прымаецца на працягу ўсяго рабочага дня (з 9 гадзін раніцы да 5 гадзін 30 мінут вечара). Усе студэнты, унёсшыя плату за навучанне, атрымліваюць ад тав. Фрыдман квітанцыю за подпісам і пячаткай універсітэта.

4. Адказнасць за ўчот і своечасовы ўзнос платы за навучанне ускладаю на бухгалтэрыю і дэканаў факультэтаў.

5. Абавязаць нам. рэктара па завочнаму навучанню тав. Суворава ў трохдзённы тэрмін паведаміць усім завочнікам аб размеры, тэрміне і парадку ўнясення платы за навучанне.

Рэктар БДУ П. САВІЦКІ.

Гісторыка-археалагічны музей БДУ праводзіць зараз вучэбныя экскурсіі студэнтаў і школьнікаў.

На здымку: дац. **В. І. Шэўчэнка** знаёміць студэнтаў-гісторыкаў з аддзелам старажытнага Егіпта.

ПЕРАБУДАВАЦЬ РАБОТУ АСОАВІЯХІМА

Асоавіяхім заклікан дапамагчы Чырвонай Арміі ў справе папаўнення падрыхтоўкі кадраў ваенных спецыялістаў—сувязістаў, кулямётчыкаў, парашутыстаў, матацыклістаў, лётчыкаў і др. На партыйныя і комсамольскія арганізацыі ўскладаецца задача кіраўніцтва работай Асоавіяхіма. Партыйнае бюро і комсамольскі камітэт універсітэта павінны дапамагчы першычай арганізацыі Асоавіяхіма хутчэй перабудаваць усю вучобу з асоавіяхімаўцамі.

Існуючая да гэтага часу практыка падрыхтоўкі значкістаў у ваенных гуртках была надзвычай аднабокай. У гуртках вывучалі матэрыяльную частку зброі, авалодвалі майстэрствам меткага выстралу па нерухомых цэлях звычайна ў добраабсталяваных цірах.

Але, каб стаць поўнацэнным байцом, мала навучыцца страляць з кулямёта або вінтоўкі, трэба быць і тактычна пісьменным чалавекам, умець рабіць перабежкі, перапаўзанні, уладаць навыкамі самаакапвання і маскіроўкі, майстэркі прымяняцца да мясцовасці, умела прымяняць гранату і штык, быць усебакова фізічна развітым і ўцягнутым у працяглыя пераходы. Інакш гаворачы, студэнты і навуковыя работнікі ў абаронных групах павінны атрымаць цвёрдыя навыкі і веды, патрабуемыя ўмовамі баявой абстаноўкі і, перш за ўсё, умовамі бліжняга бою, які мае рашаючае значэнне для зыходу бою.

Адмоўны бок абароннай работы заключаўся ў тым, што замест сістэматычнай трэніроўкі ў вучобе, толькі зрэдку праводзіліся стралковыя і фізкультурныя спаборніцтвы і яшчэ менш арганізоўваліся паходы ў працівагазах. У выніку гэтага студэнты аказваліся непадрыхтаванымі ў часе правадзімых вучэнняў.

Паходы, вучэнні і ваенныя ігры карысны тады, калі яны спалучаюцца з доўгатэрміновай ваеннай вучобай, калі яны праводзяцца для развіцця ведаў і навыкаў, атрыманых у гуртках. А гэтыя веды становяцца недастатковымі, калі яны не папаўняюцца, калі атрымаўшы спецыяльнасць не трэніруешся ўпорна і сістэматычна.

Трэба таксама адзначыць, што неад'емнай часткай абароннай работы з'яўляецца фізкультура. Фізкультурны спорт развівае і выпрацоўвае такія каштоўныя якасці, як рашучасць, ініцыятыву, вынослівасць і ваенную хітрасць — якасці, неабходныя кожнаму байцу. К нашаму сораму, не ўсе таварышы разумеюць гэта і адносяцца да фізкультуры, як да спорта, прадстаўляючага асабістую прыемнасць і не ўдзяляюць ёй патрэбнай увагі. Гэтым таварышам трэба запомніць словы тав. Варашылава: «Хто не займаецца рэгулярна фізічнай падрыхтоўкай, той упадабаецца чалавеку, свядома рашыўшаму састарыцца к 45 годам і фарсіраваць сваё адрахленне».

А. ГЛАДКІ,
выкладчык ваеннай кафедры.

ВЯЛІКАЯ І АДКАЗНАЯ РАБОТА

Па рашэнню ВЦСПС у кастрычніку—лістападзе павінны быць праведзены справаздачы і выбары кіруючых профсаюзных органаў і арганізатараў профгруп.

Выбары маюць вялікае значэнне ў сэнсе далейшага палепшання ўсёй работы прафесіянальных саюзаў—самых масавых арганізацый рабочага класа. Совецкія профсаюзы, якія налічваюць у сваіх радах 25,5 млн. чал., з'яўляюцца правадзінкамі рашэнняў партыі і ўрада, вернымі памочнікамі ў барацьбе за справу соцыялістычнага будаўніцтва.

«Справаздачы і выбары профорганаў,—гаворыцца ў пастанове прэзідыума ВЦСПС,—...павінны быць праведзены пад знакам мабілізацыі шырокіх мас членаў профсаюзаў на далейшае ўмацаванне гаспадарчай і абаронпай магутнасці Совецкага Саюза, разгортванне соцспаборніцтва і стаханаўскага руху, далейшы рост прадукцыйнасці працы і ўмацавання соцыялістычнай працоўнай дысцыпліны, на барацьбу за ліквідацыю прагулаў і самавольнага ўходу рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў».

«Перад профсаюзамі—школай комунізма—паўстала задача сур'ёзнага ўмацнення комуністычнага выхавання рабочых і служачых, узмацнення барацьбы з перажыткамі капіталізма ў сазнанні людзей, стварэння атмасферы грамадскага прэзрэння да лодыраў і тунеядцаў, якія імкнуцца жыць за кошт працы чэсных людзей, за кошт соцыялістычнага грамадства».

(«Правда»).

X пленум ВЦСПС ускрыў вялікія недахопы ў рабоце профсаюзных органаў. Разбухшыя штаты платных работнікаў падаўлялі ініцыятыву радавых членаў профсаюзаў. Пленум абавязаў усе профарганізацыі змяніць метады работы з такім разлікам, каб профорганы прыцягвалі ва ўсе галіны профработы шырокія масы членаў саюза.

Справаздача і выбары профсаюзных органаў «падвядуць першыя вынікі перабудовы профсаюзнай работы пасля X пленума ВЦСПС, адзначаць дасягнутыя поспехі і на аснове большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі ўскрыюць наяўныя недахопы».

Па рашэнню БРК саюза вышэйшай школы справаздача і выбары прафкома, профбюро і профгрупоргаў нашага універсітэта павінны пачацца з 15 лістапада. Перад нашай профсаюзнай арганізацыяй стаіць вялікая і адказная задача. Прафком, профбюро і профгрупоргі павінны адчытацца перад сваімі выбаршчыкамі за 10 месяцаў работы.

За справаздачны перыяд у нашай профарганізацыі выявіліся дзесяткі новых актывістаў, якія карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод членаў саюза. Сярод іх старшыня профбюро фізмата Харык, члены гэтага профбюро тт. Каган, Кузінец, члены профбюро т. Комлік (хімфак), Фрыдлянд (гістфак), Чарняўская, Мастовіч (біяфак).

Прафком, профбюро і профгрупоргі павінны неадкладна пачаць падрыхтоўку да справаздачна-выбарчай кампаніі. Трэба яшчэ шырэй павесці работу сярод членаў саюза за разгортванне соцспаборніцтва на лепшую якасць вучобы, за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны і ахоп профчленствам студэнтаў малодшых курсаў.

Вялікая роля ў справе падрыхтоўкі да справаздачна-выбарчага схода кладзецца на нізавыя нашы профарганізацыі—прафоргаў і профбюро. Ім патрэбна зараз-жа заняцца пытаннем прывядзення ў парадак профсаюзнай гаспадаркі (афармленне прынятых у саюз, пагашэнне запазычанасці па ўзносах і т. д.) Апошняга якраз не хочуць зразумець некаторыя члены саюза нашага універсітэта. Так, студэнты IV курса фізмата тт. Шкляр, Лапіч, Гарадзецкі, Гуткін па 5—6 месяцаў не плацяць членскіх узносаў. Прафорг гэтай групы Шкляр замест таго, каб дабіцца пагашэння запазычанасці па членскіх узносах, вось ужо некалькі месяцаў не пагашае сваю запазычанасць. Як лепшых прафоргаў трэба адзначыць тт. Мастовіч (IV курс біяфака), Фрыдлянд (II курс гістфака), якія добрасумленна адносіліся да даручэнай ім работы. У гэтых профгрупах ні адзін член саюза не мае запазычанасці па ўзносах.

Справаздача і выбары ў нашай профарганізацыі павінны садзейнічаць уцягненню новых радавых членаў саюза ў актыўную грамадскую работу нашага універсітэта.

У кіруючыя органы нашай профарганізацыі трэба выбраць самых лепшых актывістаў-студэнтаў, партыйных і непартыйных большэвікоў, здольных падняць профработу на ўзровень задач, якія пастаўлены перад совецкімі профсаюзамі нашай партыяй і ўрадам.

А. ШАКАЛЬ,
старшыня прафкома.

МЯСЦКОМ ПЕРАД ВЫБАРАМІ

Рашэнні X пленума ВЦСПС патрабуюць карэннай перабудовы ўсёй профсаюзнай работы на аснове прыцягнення шырокага актыва членаў саюза да выканання задач, пастаўленых партыяй і ўрадам.

У адпаведнасці з гэтым рашэннем МК праводзіў сваю работу, апіраючыся на актыўнасць усёй масы членаў профсаюза, прыцягваючы па магчымасці кожнага з іх к таму або іншаму віду грамадскай дзейнасці. Дзякуючы гэтаму вакол МК вырас даволі значны профсаюзны актыў. Так, напрыклад, у рабоце совета социяльнага страхавання разам з страхдэлегатамі працуе 15 членаў саюза, у жыллёва-бытавой камісіі — 8, у камісіі па зарплаце — 6 чалавек і т. д.

Для ўзмацнення профработы створаны былі новыя профгрупы ў інтэрнатах па Студэнцкай, Школьнай і вуліцы імені Фрунзе.

МК праводзіў вялікую растлумачальную работу па правядзенню ў жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.

У справе вывучэння навуковымі работнікамі асноў марксісцка-ленінскай тэорыі было намечана правесці на ўсіх факультэтах тэарэтычныя канферэнцыі. Праведзены былі канферэнцыі толькі на фізмаце, геафаку і гістфаку; на біяфаку і філфаку яны былі сарваны.

Безумоўна, у рабоце МК побач з некаторымі дасягненнямі ёсць нямала недахопаў. Мы недастаткова праводзілі работу як па павышэнню якасці як чытаемых лекцый, так і навукова-даследчай работы, слаба змагаліся за ўшчыльненне рабочага дня. Недастаткова ўдзялялася ўвага рабоце грамадскіх арганізацый.

А. А. БУДКЕВІЧ,
старшыня МК універсітэта.

Падрыхтоўка да XXIII гадавіны Кастрычніка

На філалагічным факультэце разгарнулася дзейная падрыхтоўка да XXIII гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі. Найбольш актыўную работу праводзіць прафорг II курса тав. Рымшан. Ёю распрацаван план удзелу філфака ў вечары самадзейнасці трох факультэтаў: філалагічнага, біялагічнага і гістарычнага. Паводле плана мяркуюцца выступленні членаў драматычнага і літаратурнага гурткоў. З мастацкай чыткай выступяць тт. Панцелят, Абецэдарскі, Кардашэнка, Сцежка і др.

У галіне акадэмпаспяховасці значную работу праводзіць комсамольская арганізацыя. Усе студэнты факультэта ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва.

У кастрычніцкія дні

Камісія па правядзенню свята XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі распрацавала план правядзення гэтага свята. У парадку падрыхтоўкі ў інтэрнатах праводзяцца гутаркі, на былым выбарчым участку — палітгутаркі. Бібліятэка арганізоўвае спецыяльную вітрыну, прысвечаную ўсенароднаму святу.

5 лістапада адбудзецца ўрачысты вечар студэнтаў і навукова-тэхнічных работнікаў універсітэта.

У кастрычніцкія дні будуць арганізаваны вечары самадзейнасці, дэманстрацыя кінофільмаў і т. д.

— ⊙ —

Аб рабоце насценнага друку

Ужо некалькі разоў пісала шматтыражка аб стане насценнага друку на філалагічным факультэце. Між тым, яшчэ і па сённяшні дзень комсамольская і профсаюзная арганізацыі факультэта не ўдзялялі належнай увагі палепшанню работы насценгазеты. За паўтара месяца вучобы выпушчан усяго адзін нумар. У выпуску гэтага-ж нумара ўдзельнічалі толькі члены рэдкалегіі.

У выніку газета з'явілася не масавым органам, а прадметам няўдалых практыкаванняў асобных членаў рэдкалегіі (Казлоўскі, Штыльман і др.).

ЭЛЬКІНД.

РАЗВІЦЦЁ ПРАМЫСЛОВАСЦІ І ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ РЭЗЕРВЫ

Для далейшага ўзмацнення нашай прамысловасці патрабуецца пастаянны прыток новай рабочай сілы на шахты, рудні, транспарт, фабрыкі і заводы. У распараджэнні соцыялістычнай дзяржавы павінны быць магутныя, пастаянна папаўняемыя працоўныя рэзервы. Без такіх рэзерваў не можа развівацца прамысловасць—база развіцця ўсёй народнай гаспадаркі, аснова абаронпай магутнасці нашай радзімы.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб дзяржаўных працоўных рэзервах СССР» вырашае гэтую важнейшую задачу. У ствараемых рамесленых і чыгуначных вучылішчах і школах фабрычна-заводскага абучэння будуць падрыхтаваны новыя кадры рабочых з гарадской і калгаснай моладзі.

Працоўныя рэзервы нашай соцыялістычнай дзяржавы карэнным чынам адрозніваюцца ад рэзервнай арміі працы ў капіталістычных краінах.

Беспрацоўныя, разараемыя капіталістычнай канкурэнцыяй рамеснікі і дробная буржуазія, бядняцка-батрацкая частка сістэматычна абнішчалага сялянства—вось хто стварае рэзервную армію працы пры капіталізме.

Лік беспрацоўных па далёка неадкладных афіцыяльных даных складаў у 1938 г. па 31 капіталістычнай краіне 18 млн. чалавек. Не гледзячы на тое, што другая імперыялістычная вайна паставіла пад ружжо велізарныя масы людзей і выклікала шалёны рост ваеннай прамысловасці, мільёны людзей у капіталістычных краінах ходзяць без работы.

Ва Францыі пасля яе паражэння армія беспрацоўных папоўнілася сотнямі тысяч дэмабілізаваных і бежанцаў. У адным толькі Парыжы па даных французскай улады ёсць 600 тысяч беспрацоўных. У Злучаных Штатах Амерыкі налічваецца ад 10 да 11 мільёнаў беспрацоўных.

Наша краіна не ведае беспрацоўя. У нас—планавая соцыялістычная гаспадарка. Дзяржава размяркоўвае па плану матэрыяльныя каштоўнасці і грашовыя сродкі. Яна арганізоўвае планавую падрыхтоўку, размеркаванне і скарыстанне працоўных рэзерваў.

«У нашай краіне,—гаворыцца ва Указе,—поўнасцю знішчана беспрацоўе, назаўсёды пакончана з жабрацтвам і разарэннем у вёсцы і горадзе, таму ў нас няма такіх людзей, якія-б вымушаны былі стукацца і прасіцца на фабрыкі і заводы, стыхійна ствараючы такім чынам пастаянны рэзерв рабочай сілы для прамысловасці».

Фарміраванне дзяржаўных працоўных рэзерваў з гарадской і ў асаблівасці з калгаснай моладзі стварае магчымасць рацыянальна скарыстаць тыя рэзервы рабочай сілы, якія ў нас ёсць.

Ва ўмовах капіталізма дзеці рабочых і сялян пазбаўлены ўсякіх перспектыў на атрыманне кваліфікацыі. Пры наяўнасці велізарнай рэзервнай арміі працы, капіталісты ў пагоні за танной рабочай сілай уцягваюць у вытворчасць мільёны дзяцей, падвяргаючы іх бязлітаснай эксплаатацыі. А калі гэтыя дзеці падрастаюць, іх выкідваюць з фабрык і заводаў і на іх месца набіраюць новыя мільёны дзяцей.

Совецкая дзяржава бярэ цалкам на сябе клопаты аб вытворчым абучэнні моладзі. Абучэнне у рамесленых, чыгуначных вучылішчах і ў школах фабрычна-заводскага абучэння—бясплатнае. Усе навучаючыяся ў перыяд абучэння знаходзяцца на поўным утрыманні дзяржавы. Толькі ў 1940 годзе дзяржава адпускае на справу стварэння працоўных рэзерваў мільярд рублёў. Ствараючы нябачаныя ва ўсім свеце ўмовы для набыцця моладдзю кваліфікацыі, соцыялістычная дзяржава павінна мець магчымасць скарыстоўваць гэтыя абучаныя кадры ў адпаведнасці з патрэбамі ўсёй народнай гаспадаркі.

Вось чаму Указ устанаўляе, што ўсе скончыўшыя рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння «лічацца мабілізаванымі і абавязаны прапрацаваць 4 годы падрад на дзяржаўных прадпрыемствах, па ўказанню Галоўнага ўпраўлення працоўных рэзерваў пры Совеце Народных Камісараў СССР, з забеспячэннем ім зарплаты па месцу работы на агульных падставах».

Стварэнне дзяржаўных працоўных рэзерваў, масавая падрыхтоўка рэзерваў, масавая падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых кадраў—адна з важнейшых умоў далейшых перамог соцыялістычнага будаўніцтва.

Л. МАН.

Хроніка

19 кастрычніка 1940 года ў Вучоным Совеце БДУ з абаронай дысертацыі на вучоную ступень кандыдата матэматычных навук выступіў ст. выкладчык фізіка-матэматычнага факультэта тав. Рыўкін Майсей Ефімавіч. Вучоны Совет прысвоіў тав. Рыўкіну вучоную ступень кандыдата матэматычных навук.

Ст. выкладчыку Кузміну Сяргею Фёдаравічу прысвоена вучоная ступень кандыдата біялагічных навук.

**

26 кастрычніка, у 6 гадзін вечара, у біякорпусе (313 аўдыторыя) для студэнтаў універсітэта доктар гістарычных навук, акадэмік Перцаў В. Н. прачытае лекцыю на тэму «Як працаваць над кнігай».

Адказны рэдактар
І. М. ЛЕВІН.

Мінск, друкарня «Звязды» УК1714 тыраж 1000 экз.